# III МІЖНАРОДНЫЯ ШАМЯКІНСКІЯ ЧЫТАННІ "ПІСЬМЕННІК – АСОБА – ЧАС"



27 верасня 2013 года на філалагічным факультэце прайшлі III Міжнародныя Шамякінскія чытанні "Пісьменнік – Асоба – Час". Правядзенне падобнага мерапрыемства было ў першую чаргу звязана з неабходнасцю ўшанавання памяці выдатнага сына беларускага народа, арыгінальнага пісьменніка, чые творы карыстаюцца заслужанай папулярнасцю ва ўсім культурным свеце.

Пленарнае пасяджэнне з прывітальным словам да гасцей, выкладчыкаў і студэнтаў пачаў першы прарэктар універсітэта кандыдат педагагічных навук, дацэнт В. С. Болбас. Ён падкрэсліў прыярытэт гуманітарнага досведу для фарміравання інтэлектуальна-культурнай сферы грамадства, неабходнасць і важнасць навукова-педагагічнага супрацоўніцтва.

Удзельнікамі канферэнцыі сталі звыш 80 навукоўцаў з розных рэгіёнаў Беларусі, Расіі, Украіны. Высокі навуковы статус мерапрыемства быў засведчаны выступленнямі вядомых айчынных літаратуразнаўцаў і мовазнаўцаў: доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры грамадскіх дысцыплін і права Бабруйскага філіяла УА "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт" А. М. Ненадаўца; доктара філалагічных навук, прафесара кафедры беларускай мовы УА "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны" В. А. Ляшчынскай; доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры беларускага мовазнаўства УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна" В. В. Шура і інш. Неабходна адзначыць, што 48 удзельнікаў III Міжнародных Шамякінскіх чытанняў – дактары і кандыдаты навук.

На секцыйных пасяджэннях канферэнцыі былі абмеркаваны наступныя праблемы:

– творчасць і літаратурна-грамадская дзейнасць І. Шамякіна ў кантэксце XX стагоддзя;
– літаратурныя генерацыі XX–XXI стст.: эстэтычна-аксіялагічныя пошукі;
– нацыянальны вобраз свету праз прызму часу і новыя культурныя парадыгмы;
– сучасны літаратурны працэс: праблемы зместу і формы;
– творчасць І. Шамякіна і праблемы выкладання літаратуры ў школе і ВНУ;
– мова і стыль мастацкай літаратуры;
– актуальныя праблемы сучаснай лінгвістыкі.

Для навукоўцаў Рэспублікі Беларусь літаратурна-грамадская дзейнасць І. П. Шамякіна – прыклад сумленнасці, адказнасці, арыенцір для навуковых прыярытэтаў, таму даклады, прапанаваныя для абмеркавання ў час пленарнага і секцыйнага пасяджэнняў, былі звязаны з агульнымі заканамернасцямі развіцця сучасных літаратуразнаўства, мовазнаўства, гісторыі, культуры і педагогікі.

Падчас круглага стала адбыўся абмен думкамі адносна шляхоў далейшага навуковага супрацоўніцтва, вызначаны навукова-даследчыя прыярытэты чарговых Міжнародных Шамякінскіх чытанняў.

*Загадчык кафедры літаратуры*
*кандыдат філалагічных навук*
*А. У. Сузько*

МГПУ им. И.П. Шамякина